ЦІХААКІЯНСКІ РУБЕЖ

ЧЫМ АДЗНАЧЫЛАСЯ ПАПУА — НОВАЯ ГВІНЕЯ?

Сёлетні лістапад — адназначна за Азіяй. Геапалітычны «компас» у гэты час неаднойчы «заліпаў» у бок стратэгічнага рэгіёна. На мінулым тыдні тут прайшлі некалькі знакавых мерапрыемстваў, якія без перабольшання шмат у чым прадвызначылі перспектыўны сусветны расклад. У Сінгапуры адбыўся саміт Асацыяцыі дзяржаў Паўднёва-Усходняй Азіі (АСЕАН). Пасля яго завяршэння большасць з удзельнікаў (за выключэннем хіба што расійскага лідара Уладзіміра Пуціна, якога змяніў прэм'ер-міністр Дзмітрый Мядзведзеў) перамясціліся ў Папуа — Новую Гвінею, дзе прайшоў двухдзённы XXVI саміт Азіяцка-Ціхаакіянскага эканамічнага супрацоўніцтва (АЦЭС). У Порт-Морсбі яскрава праявіліся рознагалоссі сусветных гульцоў. З-за гэтага краіны ўпершыню за амаль тры дзесяцігоддзі існавання ўплывовай міжнароднай арганізацыі не здолелі дасягнуць пагаднення падчас прыняцця выніковай дэкларацыі. Што ж адбылося ў Папуа — Новай Гвінеі?

«Бэнтлі» і барамундзі

Папуа — Новая Гвінея размешчана ў паўднёва-заходняй частцы Ціхага акіяна, займае ўсходнюю частку вострава Новая Гвінея і каля 600 прылеглых астравоў. Насельніцтва краіны складае 7,87 мільёна чалавек, пры гэтым у сталіцы Порт-Морсбі толькі каля 345 тысяч жыхароў. Тут пражывае больш за тысячу плямёнаў, прычым многія кланы, асабліва ў горнай мясцовасці, захоўваюць досыць складаную сацыяльную сістэму, якая слаба закранута зменамі: нават пад ціскам сучаснай цывілізацыі яны працягваюць кіравацца ўласнымі старажытнымі традыцыямі.

Не дзіўна, што задоўга да пачатку цяперашняга саміту ў АЦЭС непакоіліся, што адзін з найбяднейшых членаў аб'яднання — Папуа — Новая Гвінея, дзе да таго ж у лютым адбыўся магутны землятрус, не справіцца з прыёмам на сваёй тэрыторыі вялікай колькасці высокапастаўленых замежных дэлегацый. Асобныя апасенні выклікала праблема бяспекі. Але гаспадары не падвялі. Па-першае, Папуа — Новай Гвінеі дапамаглі суседзі. Аўстралія выдзеліла на патрэбы саміту АЦЭС 86,5 мільёна долараў, некалькі знішчальнікаў і патрульных караблёў, а таксама 1,5 тысячы вайскоўцаў на гарантаванне бяспекі. Па некалькі мільёнаў ахвяравалі Інданезія і Новая Зеландыя. Кітай, чый старшыня Сі Цзіньпін першым з сусветных лідараў пацвердзіў свой удзел у саміце і вырашыў сумясціць яго з дзяржвізітам, сярод усяго іншага падарыў астраўной дзяржаве камеры назірання на 12 мільёнаў долараў.

Уклаліся ў рэспектабельнае мерапрыемства і гаспадары: за тры гады падрыхтоўкі да саміту мясцовыя ўлады выдаткавалі на яго арганізацыю 300 мільёнаў долараў. У гэтую суму, дарэчы, увайшлі і выдаткі на набыццё 40 аўтамашын Maserati (кожная коштам 210—345 тысяч долараў) і трох Bentley, каб перавозіць высокіх гасцей па Порт-Морсбі. Гэта выклікала пратэсты мясцовага насельніцтва, але, як запэўніў астраўны міністр па падрыхтоўцы да АЦЭС Джасцін Ткачэнка, пасля саміту ўсе аўто прададуць у прыватныя рукі, а бюджэт зноў папоўніцца.

Прыём быў арганізаваны на найвышэйшым узроўні. Толькі некалькі дэталяў. Ужо ў першы дзень удзельнікаў саміту чакала гала-вячэра, на якой па шматгадовай традыцыі АЦЭС кіраўнікі дэлегацый з'яўляюцца ў нацыянальных касцюмах краіны — гаспадыні форуму. У кулуарах жартавалі, што традыцыйнае адзенне астраўлян — гэта набедраныя павязкі з доўгага лісця і пышныя пёравыя галаўныя ўборы. Аднак для запрошаных падрыхтавалі нацыянальныя кашулі і штаны са стылізаванай выявай масак Татануа. Культурная праграма, якая чакала высокапастаўленых удзельнікаў саміту, вядома, уключала і нацыянальныя танцы. Як паведамілі арганізатары, не абышлося без папуаскай экзотыкі. Прадэманстравалі найлепшае, што ёсць на астравах, і ў частцы пачастункаў. Як расказаў мясцовай газеце The National шэф-повар гатэля Hilton Port Moresby Пол Браўн, сусветным лідарам прапанавалі стравы з зелянінай «кума» і барамундзі — белага марскога акуня. У гэтай рыбе практычна няма костак, а яе мяса не губляе сакавітасці нават пасля доўгай тэрмічнай апрацоўкі.

На адной з урачыстых вячэр гасцям прапанавалі крабаў, скумбрыю і ялавічыну, запечаную ў традыцыйнай земляной печы. Гасцей размясцілі ў дзесяці пяцізоркавых гатэлях, яшчэ чатыры тысячы ўдзельнікаў начавалі на трох круізных лайнерах, якія выдзелілі ўлады суседняй Аўстраліі. Дарэчы, на «зялёным кантыненце» на час саміту размясціўся і віцэ-прэзідэнт ЗША Майк Пенс — палітык штодня паўтары гадзіны дабіраўся да Порт-Морсбі з паўночнага штата Квінсленд.

«Лічба» для росту

У XXVI саміце АЦЭС узялі ўдзел кіраўнікі дзяржаў і ўрадаў Расіі, Аўстраліі, Брунея, В'етнама, Інданезіі, Канады, Кітая, Рэспублікі Карэя, Малайзіі, Мексікі, Новай Зеландыі, Папуа — Новай Гвінеі, Перу, Сінгапура, ЗША, Тайланда, Філіпін, Чылі і Японіі, а таксама кіраўнік выканаўчай улады Спецыяльнага адміністрацыйнага раёна Ганконг (КНР) і прадстаўнік кіраўніцтва Кітайскага Тайбэя (Тайваня). Тэмай форуму было вызначана развіццё лічбавай эканомікі для ўмацавання эканамічнага росту. Дакладней — гаворка ішла аб зняцці бар'ераў для бізнесу і гандлю шляхам аб'яднання лічбавай прасторы ўсяго вялізнага рэгіёна.

Грунтоўную аналітыку лідарам эканомік АЦЭС прадставіў дзелавы кансультатыўны савет (ДКС). Дарэчы, гэта штогадовая завядзёнка. «Рэкамендацыі, выкладзеныя ў дакладзе, прысвечаны не толькі сусветнай эканоміцы, таксама ў іх аддадзена ўвага і развіццю Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёна, у прыватнасці, калі гаворка ідзе аб прынцыпах інклюзіўнасці і роўнасці ў АЦЭС», — заўважыў прэм'ер-міністр Папуа — Новай Гвінеі Пітэр О'Ніл. У сваю чаргу кіраўнік ДКС Дэвід Туа заклікаў краіны супрацьстаяць гандлёваму пратэкцыянізму і іншым перашкодам на шляху эканамічнай інтэграцыі, працягваць падтрымліваць цэласнасць шматбаковай гандлёвай сістэмы і рабіць намаганні для стварэння зоны свабоднага гандлю ў АЦР.

Зрэшты, абмеркаванні ішлі па плане ў рэчышчы вызначанага тэматычнага поля. Прэзідэнт Рэспублікі Карэя Мун Чжэ Ян прапанаваў стварыць фонд развіцця лічбавай эканомікі АЦЭС для садзейнічання рэгіянальнаму супрацоўніцтву і нарошчванню эканамічнага патэнцыялу ў краінах рэгіёна, якія развіваюцца, паведаміла агенцтва Yonhap. «Карэя абяцае канструктыўна садзейнічаць стварэнню і функцыянаванню лічбавага інавацыйнага фонду АЦЭС», — заўважыў Мун Чжэ Ян. Ён адзначыў, што краіна прайшла шлях эканамічнага ўздыму і дэмакратызацыі вельмі хутка, і гэта, у прыватнасці, прывяло да ўзмацнення няроўнасці ў грамадстве. Каб палепшыць сітуацыю, па яго словах, урад прыняў новую стратэгію стварэння «інавацыйнай дзяржавы».

Прэм'ер Сінгапура заклікаў эканомікі АЦЭС выпрацаваць новыя правілы электроннага гандлю, паведаміла газета The Straits Times. «Неабходна перагледзець цяперашнія правілы гандлю, улічваючы долю лічбавай эканомікі, якая расце, павелічэнне аб'ёму здзелак, а таксама колькасці ўдзельнікаў дадзенага сегмента», — перакананы Лі Сянь Лун. Паводле яго слоў, «неабходны новыя механізмы, якія дазволяць гарантаваць бяспеку і захаванасць асабістых даных удзельнікаў электроннага гандлю». Кіраўнік сінгапурскага ўрада таксама нагадаў, што Аўстралія, Сінгапур і Японія «сумесна дамагаюцца адпаведных змяненняў у фармаце Сусветнай гандлёвай арганізацыі». Але, на яго думку, удзельнікі АЦЭС «здольныя на больш маштабныя пераўтварэнні, з улікам новых тэндэнцый».

Свет занепакоены

Аднак галоўная інтрыга форуму раскрылася падчас яго закрыцця. «Увесь свет занепакоены!» — такімі словамі суправадзіў вынік саміту АЦЭС прэм'ер-міністр Папуа — Новай Гвінеі. Прычынай сталі рознагалоссі паміж краінамі-ўдзельніцамі, у першую чаргу паміж ЗША і КНР. На прэс-канферэнцыі, прысвечанай закрыццю саміту, Пітэр О'Ніл паведаміў, зрэшты, даволі ўнікліва, што менавіта гэтыя дзве дзяржавы не змаглі дамовіцца паміж сабой. «Вы ўсе ведаеце двух гігантаў у гэтай зале», — прывяло выданне The Straits Times словы прэм'ера, які таксама ўдакладніў, што пагадненняў не ўдалося дасягнуць наконт дзейнасці Сусветнай гандлёвай арганізацыі і яе рэформаў.

Лідары Аўстраліі і Канады паспрабавалі «падсаладзіць пілюлю». «Мы дасягнулі значна большага прагрэсу, чым я меркаваў», — запэўніваў журналістаў аўстралійскі прэм'ер Скот Морысан. «Не думаю, што вялікім сюрпрызам стала тое, што мы маем рознае бачанне сітуацыі», — дапаўняў канадскі калега Джасцін Трудо. Але шэраг экспертаў прыйшлі да высновы: Вашынгтон і Пекін прадэманстравалі настолькі «рознае бачанне», што далейшае існаванне фармату АЦЭС (які з'явіўся ў 1989 годзе ў канцы «халоднай вайны» і на хвалі кітайскай эканамічнай рэформы) цяпер губляе ўсялякі сэнс. «Усё зводзіцца да ўзаемнай непрымірымасці паміж ЗША і Кітаем», — канстатаваў у гутарцы з New York Times аўстралійскі эксперт Роры Мэткалф.

Па даных РБК, у ходзе саміту прадстаўнікі ЗША і Кітая неаднаразова выступалі з узаемнай крытыкай. У прыватнасці, віцэ-прэзідэнт ЗША Майк Пенс заявіў, што Вашынгтон можа падвоіць гандлёвыя пошліны на кітайскія тавары, калі Пекін не зменіць сваю гандлёвую палітыку. Сі Цзіньпін у гэты ж дзень заўважыў, што пратэкцыянізм у сучасным свеце асуджаны на правал і спробы «ўзвесці бар'еры» супярэчаць «законам эканомікі і тэндэнцыям гісторыі». «Гісторыя паказала, што канфрантацыя, яна будзе ў форме халоднай вайны, гарачай вайны ці гандлёвай вайны, не прывядзе да перамогі», — заявіў старшыня КНР у кулуарах саміту.

Пасля азіяцкіх самітаў стала відавочна, наколькі эфемерныя ўсеагульныя спадзяванні на тое, што ў ходзе сустрэчы паміж Дональдам Трампам і Сі Цзіньпінам на саміце G20 у Аргенціне ў канцы лістапада будуць дасягнуты дамоўленасці, якія прывядуць хоць бы да перамір'я ў гандлёвай вайне, ад якой пакутуе ўся планета. Але найбольшую трывогу, вядома, выклікае магчымасць ваеннага сутыкнення дзвюх галоўных эканомік свету. Супрацьстаянне яскрава праявілася ў далёкай Папуа — Новай Гвінеі. Між іншым, запаветныя астравы многія аналітыкі лічаць тым самым стратэгічным «ціхаакіянскім рубяжом», які жадаюць мець у сваім актыве галоўныя сусветныя гульцы.

Захар БУРАК.

Извещение о проведении 26 декабря 2018 года повторных аукционных торгов с условиями по продаже имущества, находящегося в собственности СООО «БЕЛВИНГРУПП»

Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе, инв. номер в ЕГРНИ)	«Административно-производственный корпус» общей площадью 8 193,90 кв. м, инв. номер в ЕГРНИ 500/U-56433; «Боксы для ремонта техники» общей площадью 262,80 кв. м, инв. номер в ЕГРНИ 500/U-56434
Местонахождение имущества	г. Минск, ул. Селицкого, 15Д, 15Д/1
Сведения о земельном участке	Площадь – 1,8579 га, кадастровый номер 500000000002004288
Продавец имущества	СООО «БЕЛВИНГРУПП», 222750, ул. Нахимова, 20, к. 402, 220033, г. Минск.
Организатор торгов	Государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск
Начальная цена, без учета НДС	1 040 000,00 долларов США
Сумма задатка	219 000,00 бел. руб.
Условие торгов	Победитель торгов (покупатель) в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в белорусских рублях в размере, эквивалентном 1,0 (одному) проценту от наивысшей цены предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, по официальному курсу Национального банка Республики Беларусь на день проведения торгов
Обременения	Ипотека

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Стоимость продаваемого имущества определяется в размере, эквивалентном наивысшей цене в долларах США, указанной в протоколе о результатах торгов, не включает НДС и подлежит оплате в белорусских рублях по официальному курсу Национального банка Республики Беларусь на день перечисления денежных средств на счет продавца в соответствии с условиями договора купли купли-продажи предмета торгов, с учетом внесенной суммы задатка.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Победитель торгов (покупатель) осуществляет оплату стоимости приобретенного имущества с учетом НДС в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся 26 декабря 2018 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 26.11.2018 по 21.12.2018 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (029) 632-32-86 (СООО «БЕЛВИНГРУПП»)